## Литература

1. Навстречу «зеленой» экономике: пути к устойчивому развитию и искоренению бедности. Обобщающий доклад для представителей властных структур. — ЮНЕП, 2011.

2. Содействие переходу Республики Беларусь к «зеленой» экономике [Электронный ресурс]. — 2014. — Режим доступа: http://greenlogic.by/about_green.html. — Дата доступа: 17.09.2016.

3. Устойчивое развитие Республики Беларусь на принципах «зеленой» экономики / НИЭИ М-ва экономики Респ. Беларусь. — Минск, 2012. — 53 с.



*Р.Дз. Статкевіч*

Навуковы кіраўнік — Дз.У. Зайцаў


# ПРАБЛЕМАТЫКА САЦЫЯЛЬНА-ПРАТЭСТНАЙ АКТЫЎНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ


*У артыкуле на аснове аналізу гістарычных падзей і статыстычных дакументаў паказана сутнасць сацыяльна-пратэстнай актыўнасці і яе асаблівасці ў Рэспубліцы Беларусь. Коратка разбіраюцца перспектывы развіцця пазначаных тэндэнцый і спосабы іх практычнага ўжывання для рэалізацыі пэўных палітыка-эканамічных стратэгій.*


Існаванне сацыяльнай няроўнасці, ад самых прымітыўных формаў яе праявы ў старажытнасці да сучаснага непрымання асобных момантаў грамадска-палітычнага жыцця, абурэння супраць існуючых парадкаў і інстытутаў улады ў цэлым, выступы супраць пэўных тэндэнцый у іх палітыцы, шчыльна звязана са спробамі яе пераадолець. У самым агульным выглядзе «няроўнасць ёсць рознасць патэнцыялаў, якая вызначае структуру грамадства і дынаміку яго развіцця, тады як барацьба супраць няроўнасці з'яўляецца тым самым дынамічным працэсам, які перыядычна пераструктуроўвае грамадства ці ж вядзе да яго разбурэння» [1, с. 176].

Пратэстныя рухі пачынаюць развівацца як сродкі мабілізацыі групавых рэсурсаў у тым выпадку, калі ў насельніцтва адсутнічаюць інстытуцыянальныя формы выказвання свайго меркавання або калі ўлады выступаюць з рашэннямі, якія закранаюць становішча людзей [2]. Магчымасць удзелу сацыяльных груп у палітычных адносінах адыгрывае асноўную ролю ў вызначэнні таго, ці будуць іх члены выкарыстоўваць розныя формы сацыяльнага пратэсту для дасягнення сваіх мэт.

Пачатак трэцяга тысячагоддзя для Беларусі характарызуюць як адносна стабільны [3, с. 26], пэўнае эканамічнае развіццё краіны дазволіла беларускаму грамадству эвалюцыянаваць у кантэксце праяўлення сваіх запытаў да ўлад. Сучаснае непрыманне і пратэстная дзейнасць відавочна адрозніваецца сутнасцю і маштабам сваёй праявы ад падзей, якія мелі месца быць у перыяд станаўлення Беларусі незалежнай дзяржавай. На той час стаяла пытанне

практычна пра выжыванне нацыі. Праблема галечы, бяспраўя і адсутнасці будучыні была татальна: людзі выходзілі на вуліцы дзеля ўласнага выратавання [4]. Пры ўсіх шматлікіх язвах рэгіянальная дыферэнцыяцыя істотна лакалізавала праблемы, грамадства ў цэлым стала значна паспяховей у параўнанні з 1990-мі гг. [5, с. 82]. Грамадства, большая частка якога застала падзеі 1990-х гг., перайшло на іншы праблематычны ўзровень. Адпаведна і канкрэтны, змястоўны пратэст адышоў у межы мясцовага самакіравання. Перспектыва стыхійнага агульнанацыянальнага абурэння становіцца вельмі абстрактнай, а ролю адзінай інфа-нагоды падобнага маштабу выконваюць вынікі прэзідэнцкіх выбараў. Гэта пацвярджаецца тым фактам, што самыя маштабныя акцыі пратэсту за апошнія дзесяць год звязаны з рэакцыяй апазіцыйных партый і грамадскіх аб'яднанняў на вынікі выбараў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь [6; 7]. Колькасць удзельнікаў у традыцыйных для апазіцыйных і незадаволеных слаёў насельніцтва мерапрыемствах («Дзень Волі», «Чарнобыльскі шлях»), якія акрамя гістарычна-традыцыйнай значнасці змяшчаюць сацыяльна-палітычны пратэст, падае [8].

Прычыны падзення цікавасці да актыўных форм негвалтоўнага выказвання свайго абурэння супраць эканамічных і сацыяльных няроўнасцей або супярэчных палітычных рашэнняў звязваюць з вельмі жорсткай пазіцыяй улад адносна пратэстуючых — большасць публічных мерапрыемстваў маюць негатыўныя наступствы для іх удзельнікаў. Але нават у такіх неспрыяльных умовах палітычныя арганізацыі падтрымліваюць «тонус» пратэстнай актыўнасці, праўда, з большага за кошт акцый у форме пікетаў, перформансаў з удзелам аднаго-двух альбо літаральна некалькіх актывістаў [9, с. 14].

Іншай прыкметнай асаблівасцю сацыяльных пратэстаў у Беларусі з'яўляецца празмерная палітызацыя любой пратэстнай актыўнасці. Апазіцыйныя сілы спрабуюць выкарыстоўваць незадаволенасць насельніцтва пэўнымі працэдурнымі або лакальнымі пытаннямі дзеля нарастання пратэстных настрояў і пашырэння сацыяльнай базы незадаволеных дзеючымі ўладамі розных узроўняў. Падтрымка апазіцыяй сацыяльных пратэстаў мае негатыўны характар, бо вядзе да адыходу ад першазаяўленых праблем насельніцтва і паступоваму памяншэнню колькасці непасрэдна закранутых праблемай сярод удзельнікаў.

Падобныя тэндэнцыі (адсутнасць пратэстнага патэнцыялу і цікавасці да альтэрнатыў, прапануемых апазіцыяй) ствараюць для ўлад маштабнае поле для рэалізацыі пэўных стратэгій рэфармавання існуючай рэчаіснасці, як эканамічнай, так і палітычнай.

Сцэнара развіцця падзей у данным выпадку краіна мае два: карыстаючыся абставінамі і крэдытам даверу з боку грамадзян, улады прымуць рашэнне чакаць змены кан'юнктуры сыравіннага рынку і паляпшэння эканомікі галоўнага эканамічнага партнёра краіны — Расійскай Федэрацыі; або недэкларатыўна праводзіць мерапрыемствы, якія будуць дэ-факта з'яўляцца тымі самымі непапулярнымі рэформамі. У прыватнасці, у гэтым годзе быў падпісаны ўказ аб павышэнні пенсіённага ўзросту, а таксама былі павышаны тарыфы на паслугі ЖКГ. Менавіта пра падобныя змены як пра першы крок

на шляху да структурных рэформаў шла размова ў патрабаваннях кіраўніцтва Сусветнага банка і кіраўніка місіі МВФ у Беларусі Дэвіда Хофмана.

Для правядзення буйнамаштабных структурных рэформаў беларускім уладам неабходна падтрымліваць высокі ўзровень даверу сярод насельніцтва. Арганізаваная пратэстная актыўнасць не пагражае дзяржаўнасці або асновам канстытуцыйнага ладу, а ў рэчаіснасці павышае давер да гэтага самага ладу і яго інстытутаў. Унутраны парадак заснаваны на ўнутранай згодзе людзей і некаторым мінімуме грамадскіх інтарэсаў, каштоўнасцей або нормаў. Дасягненне згоды разглядаецца як вынік перамоў паміж грамадствам і ўладамі. «Мэта заключаецца не ў тым, каб ліквідаваць ці прадухіліць канфлікт, а ў тым, каб зрабіць яго прадуктыўным» [10, с. 17].

Такім чынам, сацыяльна-пратэстная актыўнасць (як адна з формаў імпульсаў-патрабаванняў) з'яўляецца фактарам, які ўздзейнічае на развіццё як грамадства, так і палітычнай сістэмы ў тым выпадку, калі яна завяршаецца ўзаемнай згодай паміж пратэстуючымі і ўладамі. Дзеля гэтай згоды і магчымасці наладзіць дыялог «грамадства—ўлады» спачатку трэба прайсці праз канфліктную сітуацыю. Таму памяншаючы ціск на сацыяльныя інстытуты і іх механізмы, якія дапамагаюць выказваць сваё меркаванне адносна пэўных падзей, дзяржава спрыяе росту даверу да ўлад на ўсіх узроўнях кіравання.

## Літаратура

1. *Лашевская, А. Д.* Социальный протест и социальная критичность: новые времена / А. Д. Лашевская // Вестн. Перм. ун-та. Философия. Психология. Социология. — 2013. — № 2 (14). — С. 175–186.

2. *Tilly, Ch.* From mobilization to revolution / Ch. Tilly. — Addison Wesley, 1978.

3. Социальное положение и уровень жизни населения Республики Беларусь : стат. сб. / редкол.: В. И. Зиновский [и др.]. — Минск, 2005. — С. 26.

4. *Киреенко, Е. Г.* Социально-экономическая география Республики Беларусь / Е. Г. Кириенко. — Минск : Аверсэв, 2003.

5. Партизанская республика. Акции протеста в Минске 19–25 марта 2006 года / Д. Костенко [и др.] ; под ред. Е. Михайловской. — Могилев : Центр Панорама, 2006.

6. Belarus election ends with violent protests [Electronic resource] // News portal «cbcnews», 2010. — Mode of access: http://www.cbc.ca/news/world/belarus-election-ends-with-violent-protests-1.916848. — Date of access: 27.09.2016.

7. День Воли. Как это было в 90-х, 2000-х и сейчас [Электронный ресурс] // Информационный портал Naviny.by. — Минск, 2015. — Режим доступа: http://naviny.by/rubrics/society/2015/03/25/ic_articles_116_188536. — Дата доступа: 27.09.2016.

8. *Чыжова, Т.* Пратэстная актыўнасць у Беларусі ў 2013 годзе: масавыя акцыі, палітычныя перформансы, сацыяльныя канфлікты / Т. Чыжова. — Мінск : Палітычная сфера, 2014. — С. 13–16.

9. *Deutsh, M.* The Resolution of conflict / M. Deutsh. — New Haven : Yale University Press, 1977. — P. 17.